ПАЛАЖЭННЕ
аб парадку правядзення раённага этапа гарадскога фестывалю народнай творчасці «Сузор'е»

I. Агульныя палажэнні

1.1 Раённы этап гарадскога фестывалю народнай творчасці «Сузор'е» (далей – фестываль) праводзіцца на падставе Палажэння аб парадку правядзення фестывалю народнай творчасці «Сузор'е» (далей – Палажэнне), у адпаведнасці з рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 11 снежня 2025 года № 5056 «Аб зацвярджэнні пераліку гарадскіх фестываляў, конкурсаў, форумаў, святаў і пленэраў, якія фінансуюцца з мясцовага бюджэту» і Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (артыкул 250).

II. Мэты і задачы фестывалю

2.1 Палажэнне вызначае мэты і задачы фестывалю, парадак, умовы яго правядзення, падвядзенне вынікаў і заахвочванне ўдзельнікаў фестывалю.

2.2. Мэта правядзення фестывалю: павышэнне сацыяльнай ролі і мастацкага ўзроўню народнай творчасці, яе ўплыву на развіццё грамадскай і працоўнай актыўнасці прадстаўнікоў арганізацый, устаноў і жыхароў Цэнтральнага раёна г.Мінска.

2.3. Задачы:

- выяўленне, развіццё і рэалізацыя творчага патэнцыялу, здольнасцей прадстаўнікоў арганізацый, устаноў і жыхароў Цэнтральнага раёна г.Мінска;
- пацверджанне непрафесійнымі (аматарскімі) калектывамі мастацкай творчасці наймення «народны», «узорны»;
- папулярызацыя лепшых узораў музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, відэа, фота і іншых відаў і жанраў народнага мастацтва;
- захаванне пераемнасці ў развіцці народнай творчасці;
- шырокае далучэнне працоўных, служачых, моладзі, падлеткаў, дзяцей да заняткаў народным мастацтвам;
- развіццё ў працоўных калектывах, навучальных установах, установах культурна-асветніцкай дзейнасці і дадатковай адукацыі самадзейных калектываў, гурткоў, студый, майстэрняў, аб'яднанняў па інтэрэсах розных відаў і жанраў народнага мастацтва;

- абагачэнне рэпертуару аматарскіх калектываў творамі народнага мастацтва, беларускіх аўтараў, лепшымі ўзорамі айчыннай і сусветнай мастацкай культуры;

- павышэнне ўзроўню выканаўчага майстэрства і сцэнічнай культуры калектываў народнай творчасці;

- стварэнне спрыяльных умоў для развіцця творчай дзейнасці ў самадзейных мастацкіх калектывах, супрацоўніцтва майстроў самадзейнага мастацтва;

- арганізацыя вольнага часу жыхароў Цэнтральнага раёна г.Мінска.

III. Арганізатары фестывалю:

3.1. Адміністрацыя Цэнтральнага раёна г.Мінска (далей - адміністрацыя).

IV. Тэрміны правядзення фестывалю

4.1. Першы этап фестывалю праводзіцца па 1 кастрычніка 2026 года ва ўстановах адукацыі**,** арганізацыях, на прадпрыемствах Цэнтральнага раёна г.Мінска.

4.2. Другі этап фестывалю праводзіцца:

- з 1 па 15 кастрычніка 2026 года сярод калектываў народнай творчасці і асобных выканаўцаў, пераможцаў першага этапа, у тым ліку ўключае агляд выстаў, калектываў дызайну і пашыву адзення*;

- 26 лістапада 2026 года ў форме гала-канцэрта лепшых калектываў і асобных выканаўцаў на базе ДУА «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Кантакт» г.Мінска» (г.Мінск, вул.М.Танка, 8)*.

V. Удзельнікі фестывалю

5.1 У фестывалі прымаюць удзел творчыя калектывы (хары і ансамблі народнай песні, фальклорныя калектывы, хары ветэранаў, дзіцячыя хары, ансамблі песні, музыкі і танца, калектывы з эстраднай манерай выканання, харэаграфічныя і інструментальныя ансамблі, аркестры, тэатры і інш.), асобныя выканаўцы прадпрыемстваў, арганізацый, клубных і навучальных устаноў, агульнаадукацыйных і музычных школ, устаноў дадатковай адукацыі, жыхароў Цэнтральнага раёна г.Мінска, якія не маюць ганаровых званняў «народны», «узорны».

Калектыў уставы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» удзел не прымае.

VI. Умовы правядзення фестывалю

6.1.Умовы правядзення фестывалю народнай творчасці «Сузор’е» на I этапе распрацоўваюцца і забяспечваюцца арганізацыйна і фінансава адказнымі па сваіх напрамках.

Арганізацыя і правядзенне II этапа забяспечваецца адміністрацыяй.

У рэпертуар могуць быць уключаны творы самадзейных і прафесійных аўтараў.

Калектывам, якія маюць ганаровыя званні «народны», «узорны», дазваляецца прыцягваць да ўдзелу ў конкурсе выканаўцаў – прафесіяналаў выключна ў якасці салістаў, у ацэнку калектыву будзе ўключацца толькі суправаджэнне.

Выкарыстанне плюсавых фанаграм для ўдзельнікаў забараняецца.

6.2. Фестываль праводзіцца па наступных жанрах:

- вакальны (сола, ансамблі);
- харэаграфічны;
- арыгінальны жанр (фокусы, жанглiраванне, пластыка, пантаміма, гімнастыка);
- харавы;
- інструментальны;
- тэатральны;
- відэа, фота;
- народная творчасць;
- выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

6.3. Пры ацэньванні рэпертуару калектываў і выканаўцаў улічваецца:

- узровень выканаўчага майстэрства;
- складанасць рэпертуару;
- сцэнічнасць;
- рэжысура нумароў і праграм;
- музычнае суправаджэнне;
- выкананне ўмоў Палажэння.

6.4. Пры ацэньванні выстаў улічваецца:

- адраджэнне і развіццё беларускіх нацыянальных рамёстваў;
- мастацкі ўзровень выставачных твораў;
- спалучэнне элементаў традыцыйнай творчасці з культурай гарадскога асяроддзя;
- мастацкі густ;
- экспазіцыйна-тэматычнае рашэнне;
- ужыванне новых тэхнік і тэхналогій;
- выставачная і грамадска-карысная дзейнасць.

6.5. Пры ацэньванні калектываў дызайну і пашыву адзення ўлічваецца:

- мастацкі ўзровень;
- арыгінальнасць творчай ідэі, майстэрства выканання;
- канструктывізм;
- паўната раскрыцця тэмы;
- сцэнічная культура;
- музычнае суправаджэнне.

6.6. Заяўкі (дадатак 1, 2) прадстаўляюцца **да 1 кастрычніка 2026 года** ў адміністрацыю (220004, г.Мінск, ул. Мельнікайтэ, 6, каб. 314

тэлефоны для даведак: +375 17 242 24 35), альбо накіроўваюцца па электроннай пошце: cen.ideolog@minsk.gov.by .

VII. Падвядзенне вынікаў фестывалю

7.1 Па выніках I і II этапаў фестывалю лепшыя калектывы, асобныя выканаўцы, кіраўнікі калектываў узнагароджваюцца дыпломамі Лаўрэата I, II, III ступеняў, таксама магчыма ўзнагароджванне каштоўнымі падарункамі.

VIII. Фінансаванне фестывалю

8.1 Фінансаванне фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў адміністрацыі згодна з каштарысам расходаў на правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў для жыхароў Цэнтральнага раёна г.Мінска на 2026 год.

*Час удакладняецца